# Пачатак і заканчэнне Другой сусветнай вайны

## Занятак / метадалогія

Урок
45 хвілін

Дадатковы
матэрыял

Занятак /
метадалогія

# Азначэнне паняцця «вайна»

**Занятак можа быць праведзены як уводны да тэмы «Пачатак і заканчэнне Другой сусветнай вайны»; аптымальны ў якасці ўводнай тэмы для метаду «Таймлайн / храналагічная шкала падзей».**

| | |
|---|---|
| Працягласць | 45 хвілін |
| Матэрыялы | Настаўнік павінен падрыхтаваць пустыя карткі для запісу, паперу для запісу азначэння, паперу для фліпчарта |
| Задачы | Напісаць азначэнне паняцця «вайна», выкарыстоўваючы ключавыя словы; зразумець/вызначыць, што можа выклікаць вайну; зразумець/вызначыць, калі сканчаецца вайна; ужыць гэтыя веды да Другой сусветнай вайны |

## Метадалогія

**Метад «падшыпніка» (“Ball bearing”) / брэйнстормінг / праца ў парах / метад «ціхага абмеркавання» (“Silent discussion”) / запісваюць вызначэнне, выкарыстоўваючы ключавыя словы**

### Метад «падшыпніка»

Навучэнцы ўтвараюць два кругі – знешні і ўнутраны, – пры гэтым навучэнцы знаходзяцца тварам адно да аднаго ў парах. Пары абменьваюцца меркаваннямі па тэме. Пасля заканчэння ўстаноўленага часу кругі паварочваюцца ў адваротным кірунку такім чынам, каб тварам адно да аднаго знаходзіліся новыя ўдзельнікі абмеркавання. Выразная структура метаду дае навучэнцам пачуццё абароненасці, дазваляе забяспечыць інтэнсіўны, разнастайны кантакт у бяспечнай прасторы групы. Нават неаднаразовае паўторнае абмеркаванне адной і той жа тэмы дапаможа растлумачыць і структураваць думкі асобнага ўдзельніка і больш глыбока абдумаць тэму(ы).

1. Вучні стаяць у парах ва ўнутраным і знешнім кругах, тварам адно да аднаго.

2. Мадэратар паказвае, што павінна пачацца абмеркаванне або агульнае дзеянне. Навучэнцаў інфармуюць пра тое, колькі ў іх ёсць часу на абмен ідэямі.

3. Па заканчэнні абумоўленага часу (каля 2-3 хвілін) мадэратар дае сігнал аб завяршэнні ўсімі абмеркавання. Навучэнцаў просяць развітацца, а затым зрушыцца паводле правіла зруху (напрыклад: «Унутраны круг зрушваецца на два месцы направа. Знешні круг зрушваецца на адно месца налева»). Навучэнцы мяняюцца месцамі згодна з указаным правілам. Такім чынам, пры кожным зруху ўтвараюцца новыя пары для абмеркавання.

4. Затым наступае новы раўнд абмеркавання зададзенай працягласці. Пары не павінны ў абавязковым парадку абмяркоўваць факталагічныя пытанні; можна прапанаваць апцыянальныя альтэрнатыўныя варыянты, напрыклад практыкаванні на расслабленне, абмеркаванне (у парах або ў невялікіх групах) актуальных пытанняў або праблем і інш.

## Метад «ціхага абмеркавання»

«Ціхае абмеркаванне» – метад, у якім навучэнцы запісваюць (на вялікім аркушы) свае ідэі, думкі, меркаванні, пытанні ці факты ў адказ на сцвярджэнне або пытанне, прапанаваныя для разгляду. Навучэнцы таксама могуць рабіць каментарыі ў пісьмовай форме або запісваць пытанні да нататак іншых навучэнцаў. У выніку азнаямлення з напісаным іншымі могуць з'явіцца свежыя ўласныя ідэі для запісу.

Гэты метад аптымальны для тых навучэнцаў, якія занадта сарамлівыя для выступу перад класам, а таксама для тых, каму трэба натхненне для ўласных ідэй.

- Настаўнік рыхтуе тры вялікія аркушы, на кожным з якіх паказвае розныя сцвярджэнні або пытанне па пэўнай тэме.
- Навучэнцы могуць выбраць аркуш, з якога пачнуць, і, перамяшчаючыся ад аркуша да аркуша, запісваюць уласныя думкі і ідэі альбо чытаюць запісанае іншымі і пішуць свае каментарыі ці пытанні.

Тут ёсць толькі адно правіла: усе навучэнцы павінны маўчаць.

- Затым клас падзяляюць на тры групы, па адной групе на кожны аркуш. Кожная група абмяркоўвае паміж сабой тое, што запісана на іх аркушы.
- Пасля абмеркавання кожная група прэзентуе (у ходзе пленарнага пасяджэння) той аркуш, які яна абмяркоўвала.

---

# Прапанова для магчымага плана ўрока

## Метад «падшыпніка» (глядзіце інфармацыю, прыведзеную вышэй)

Вучні павінны сабраць усе ідэі пра тое, што ёсць «вайна», і зрабіць уласныя пазнакі.

**Рэкамендаваныя пытанні, якія можна задаць у межах абмеркавання метадам «падшыпніка»:**

- Што такое вайна? Калі мы гаворым пра вайну?
- Назавіце магчымыя прычыны вайны / прычыны для развязвання вайны.
- Калі вайна афіцыйна абвяшчаецца завершанай? (Напрыклад: калі спыніліся баі або абвешчана пра спыненне баявых дзеянняў ці пасля падпісання дамовы пра мір і інш.)

---

## Індывідуальная праца

Навучэнцы запісваюць на пустых картках ключавыя словы зыходзячы з таго, што яны даведаліся.

---

## Брэйнстормінг / візуальна-сэнсавая асацыятыўная карта

Навучэнцы размяшчаюць свае карткі на дошцы і сумесна з настаўнікам выбудоўваюць візуальна-сэнсавую асацыятыўную карту шляхам сартавання сваіх ідэй/вынікаў.

## Праца ў парах або ў невялікіх групах

Навучэнцы запісваюць на аркушы азначэнне тэрміна «вайна» разам з пералікам прычын, якія могуць прывесці да вайны, выкарыстоўваючы візуальна-сэнсавую асацыятыўную карту на дошцы, і размяшчаюць свае азначэнні на дошцы.

## Пленарнае пасяджэнне

Навучэнцы зачытваюць уголас свае азначэнні. У канцы яны вырашаюць, якое з азначэнняў лепш апісвае вайну.

## Метад «ціхага абмеркавання»

Настаўнік рыхтуе тры аркушы для фліпчарта і ў цэнтры кожнага запісвае адно сцвярджэнне або пытанне па тэме:

- Напад на Польшчу 1 верасня 1939 года як пачатак Другой сусветнай вайны;
- Напад на СССР 22 чэрвеня 1941 года;
- Канец Другой сусветнай вайны.

Вучні павінны абмеркаваць сцвярджэнне або пытанне, запісваючы, што яны ведаюць ці хацелі б даведацца.

## Пленарнае пасяджэнне

Клас дзеляць на тры групы, па адной на кожны аркуш. Удзельнікі кожнай групы абмяркоўваюць паміж сабой тое, што запісана на іх аркушы. Затым кожная група прэзентуе (у ходзе пленарнага пасяджэння) тую паперу, якую навучэнцы абмяркоўвалі.